Урок 16, дата________ **ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ** **4 КЛАС**

**ТЭМА: Пазакласнае чытанне. Дзе карані твае, адкуль твой род пачаўся…**

**МЭТА:** спрыяць спасціжэнню вучнямі ідэі і маральнай высновы твораў на данную тэматыку

**ЗАДАЧЫ:**

арганізаваць чытанне-разглядванне кніг, у якіх ёсць творы па тэме заняткаў;
падагульніць чытацкі вопыт вучняў па адборы кніг для самастойнага чытання на тэму;
абмеркаваць найбольш цікавыя самастойна прачытаныя творы;
вучыць дакладна выказваць свае думкі, даказваць свой пункт погляду;
развіваць мову вучняў, мысленне, узбагачаць слоўнікавы запас вучняў;
ствараць умовы для выхавання патрыятызму, захавання сямейных каштоўнасцей.

*Матэрыял для чытання:*
*Эдзі Агняцвет. «Слова пра маці».*
*Лёля Багдановіч. «Адзіная, як маці!».*
*Васіль Вітка. «Вавёрчына гора».*
*Артур Вольскі. «Татаў родны куток».*
*Янка Купала. «Над калыскай».*
*Уладзімір Ліпскі. «Праўдзівы аповед пра твой і мой радавод».*
*Алесь Ставер. «Унуку».*
*Васіль Сумараў. «Мой дом».*
*Віктар Швед. «Я нарадзіўся беларусам».*
*Васіль Шырко. «Дзед Манюкін і ўнукі».*

## ХОД УРОКА

**І. Арганізацыйны момант**

«Дапоўні прыказку».

Я кажу першую частку прыказкі, а вы павінны дадаць другую.

*Дарагая тая хатка...  дзе радзіла мяне матка.*
*Няма смачней вадзіцы... як з роднае крыніцы.*
*Родная зямля мякчэй...  за чужую пярыну.*
*У чужой старонцы…  не так свеціць сонца.*
*З роднай крыніцы ...  смачна напіцца.*
*Бацькоў шануй – ...  старых паважай.*
*Як ты шануеш бацькоў, так ....цябе будуць шанаваць твае дзеці.*
*Добрыя дзеці бацьку і маці – ....апора ў хаце.*

Пропускам на заняткі для ўсіх нас стануць беларускія словы з “чароўнага” куфэрка.

*Дзеці выцягваюць карткі са словамі з “чароўнага” куфэрка, чытаюць і тлумачаць іх значэнне. Калі хто-небудзь з вучняў адчувае цяжкасці ў тлумачэнні слоў, то вучням класа дазваляецца дапамагаць сябрам.*

**Прыкладныя словы для выкарыстання:**

*Бацькаўшчына, род, народ, племя, традыцыі , дзякую, ганаруся, прыгожая, продкі, нашчадкі, спадчына, гістарычнае мінулае, бацькоўскі запавет.*

Вучні адказваюць з апорай на веды, атрыманыя па курсу "Мая Радзіма — Беларусь".

**Абагульняючы адказы дзяцей, настаўнік тлумачыць значэнне слоў.**

**Род:** 1. У першабытным грамадстве саюз некалькіх сем'яў, звязаных адносінамі сваяцтва, агульнасцю гаспадаркі. 2. Пакаленні, якія паходзяць ад аднаго продка.

**Племя** — аб'яднанне людзей, звязанных адносінамі роду, агульнай мовай і тэрыторыяй, на якой яны жывуць.

- Як сёння мы называем аб'яднанні людзей, звязаных агульнай мовай і тэрыторыяй пражывання? (Народ, жыхары пэўнай краіны.)

**Традыцыі** — звычай, парадак, нормы паводзін, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

## II. ЗНАЁМСТВА З ВЫСТАВАЙ. ВЫЗНАЧЭННЕ ТЭМЫ ЎРОКА. ПАСТАНОЎКА ЗАДАЧ МАТЫВАЦЫЯ

Пачаць наш урок мне хочацца вершам Анатоля Пісьмянкова “Продкі”

(настаўнік чытае верш)

Калі марнею ад нягод
І ў сэрцы цесна,
Я ўспамінаю радавод
І продкаў песні.

Яны ідуць за годам год
З мячом і плугам.
О, мой нязводны род,
Ён моцны духам!

Імёны памяць берагла,
Вяла праз церні,
Каб я не сеяў зла,
А толькі зерне.

Да іх іду я зноў і зноў,
Ім веру свята.
Таму й вяду сваіх сыноў
Да іх на раду.

Апошні слупок гэтага верша сёння з’яўляецца эпіграфам да нашага ўрока. (перачытаць апошні слупок яшчэ раз і растлумачыць слова рада)

Як вы разумееце гэтыя радкі?

## III. РАБОТА ПА ТЭМЕ ЎРОКА

-У чаго ёсць карані? (У раслін.)

- Якія карані ў чалавека? (Карані чалавека — гэта продкі, пакаленні, якія раней жылі на нашай зямлі.)

- Я, Ты, Ён, Яна — людзі на планеце Зямля. Што мы робім? Жывём! Дыхаем і плачам. Спрачаемся і радуемся. Кахаем і ненавідзім. Ваюем і сябруем. Жывём, як маятнік: туды-сюды, дзень-ноч, галодны-сыты, адзеты-голы, шчаслівы-гаротны, свой-чужы... Маятнік хай цікае далей. А мы задумаемся: свой і чужы? Ці правільна, што дзелім людзей на процілеглыя лагеры? Мо адсюль вытокі войнаў, боек, калатнечы, варожасці, падазронасці, ганьбы, здзекаў? Давайце задумаемся: які радавод кожнага з нас, хто той




пра-пра-продак, ад якога пайшлі пакаленні вашага радаводу? Японскія вучоныя доўга даследавалі гены розных пакаленняў людзей і склалі мадэль нашай старажытнай прародзічкі. Ёю аказалася агульная Мама, якая жыла некалі ў Афрыцы. Выходзіць, што ўсе мы ад Адама і Евы. Ад іх — нашы карані. А гэта азначае, што на свеце, на планеце Зямля мы, усе людзі, — радня, родзічы. Толькі пра гэта мы мала ведаем, а часам нават і не здагадваемся. Тым не менш у кожнага чалавека сваё імя. Непаўторнае! Кожны чалавек — Асоба. Кожнае чалавечае жыццё — кніга. Атрымліваецца, што кожны чалавек — гэта цэлая планета. Не верыце? А давайце разам намалюем гэту чалавечую планету. У цэнтры паставім — Я. Гэта толькі ў алфавіце Я — апошняя літара. А ў жыцці кожнае Я — галоўная фігура, стрыжань, вакол якога адбываюцца ўсе падзеі. Вакол Я правядзём паўкруг, вясёлку, карону, адным словам, як хто ўяўляе той арэол над сабой. Далей правядзём яшчэ адну дужку. Атрымаем арбіту з дзвюх раўнацэнных палавін: бацька і маці. Яны далі нам жыццё. Мы ў вечным і неаплатным даўгу перад імі. На іх молімся. Яны сняцца нам, не пакідаюць нас, калі нават адыходзяць у вечнасць. Над нашымі бацькамі — свая арбіта: нашы бабкі і дзядулі. Іх у кожнага з нас — чатыры. І гэта не залежыць ні ад якіх жыццёвых сітуацый: сіратой чалавек гадаваўся ў сям'і, з адной маці ці з адным бацькам. Усё роўна на гэтай вышыні яго "нараджалі" чацвёра людзей і перадалі яму жыццёвы факел. І калі далей такім чынам будаваць арбіты, то блізкія, роднасныя сувязі з кожным новым вітком удвойваюцца. У трэцім калене ў кожнага з нас ужо восем прабабак і прадзедаў. У чацвёртым — шаснаццаць, у пятым — трыццаць два. А ў дзесятым — тысяча дваццаць чатыры! Хто яны, што прывялі нас у сённяшняе жыццё? Ці апраўдваем іх давер? Ці ўдзячны ім? Ці зрабілі крок да таго, каб нешта даведацца пра іх колішняе існаванне? Яшчэ ўлічым, што ў кожнага з тысячы дваццаці чатырох нашых продкаў былі свае браты, сёстры, дзядзькі, цёткі. А ў тых — свае дзеці. Дык вунь які пласт радні меў кожны з нас усяго трыста гадоў назад! А тысячу гадоў назад

хто былі нашымі родзічамі? Якімі яны былі? Што адбывалася ў свеце? Дзеці — спадарожнікі планеты Сям'я. На ёй яны напаўняюцца мудрасцю, сілай, жыццёвым зарадам. І, адчуўшы моц у крылах, з дапамогай бацькоў узлятаюць на сваю арбіту. Ствараюць сваю жыццёвую планету. Так было. Так ёсць. Так будзе. Вось і складваецца простая і мудрая формула чалавечай сям'і: Я плюс Я — сям'я. Сям'я плюс сям'я — род. Род плюс род — народ. Народ плюс народ — людзі Зямлі. Дай жа, Божа, каб гэты жывы людскі мацунак быў вечным. Хай кожны чалавек стане вобразам Дабрыні, Розуму і Любові. Тады і мы станем Людзьмі. І захочацца нам адзін аднаго называць родзічам. Можа, тады і Зямля наша ператворыцца ў планету Шчасця?

Уладзімір Ліпскі

На свеце ёсць словы, якія мы называем святымі. І адно з такіх святых, цёплых, ласкавых слоў — гэта МАМА. «Мама» — першае слова, якое з любоўю і ўсмешкай вымаўляе дзіця! Мама — гэта слова, якое часцей за ўсё паўтарае чалавек у дзень радасці ці гора, яно — самае пяшчотнае і самае шматграннае. І колькі б нам ні было гадоў, пяць ці пяцьдзясят, нам заўсёды патрэбна мама, яе пяшчота, дабрыня, клопат і яе парада.

Паводле народнай мудрасці, бацька фарміруе розум, а маці лашчыць душу. І гэта сапраўды так. Мужчына імкнецца прадоўжыць сябе ў справах сваіх рук і розуму, у імені і прозвішчы дзіцяці, а жанчына дае жыццё новаму чалавеку, вучыць адрозніваць дабро і зло.

Ад маці мы атрымліваем свае першыя ўрокі. Дзень маці ў Беларусі супадае з вялікім народным святам Пакроваў. Паводле тлумачэнняў праваслаўнай царквы, Пакровы — пакрывала Божай маці, якое засланяла і абараняла людзей ад бяды *(дэманструюцца іканапісныя творы).* Так і нашы мамы гатовы абараняць нас ад любога няшчасця.

Верш Яўгена Крупенькі «Мама».

*Так, як маці, на свеце ніхто не ўмее*
*За дзяцей хвалявацца і перажываць.*
*Так, як маці, ніхто не ўмее на свеце*
*Немаўлят сваіх песціць, калыханку спяваць*
*Так, як маці, ніхто цябе не разумее,*
*Яна словам суцешыць заўсёды ў бядзе.*
*Ад матуліных слоў цэлы свет харашэе,*
*Не, ніхто не заменіць, матуля, цябе...*

У нас сёння незвычайная выстава. Гэта фотаздымкі вашых родных. Тут яны маладыя, прыгожыя, вясёлыя, хоць за плячыма некаторых, напэўна, няпростае жыццё.

Скажыце, за што вы можаце падзякаваць сваім татам, мамам, бабулям, прабабулям? (за ласку, пяшчоту, добрыя парады, дапамогу)

А папрасіць прабачэння? Не кожны захоча сказаць пра гэта ўголас, але можна зрабіць так: пакласці руку на фотаздымак. Я ўпэўнена, што родныя адчуюць гэта, а вам на сэрцы стане весялей. (дзеці падыходзяць да фотаздымкаў)

**Адказы вучняў па тэме**

**Чытанне твораў падрыхтаванымі вучнямі, абмеркаванне зместу прачытаннага**
План:

1. Прагназаванне зместа па назве.
2. Слоўнікавая работа.
3. Знаёмства з творам.
4. Эмоцыі ад успрымання твора.
5. Суаднясенне прагноза і зместа.
6. Тэма.
7. Цэнтральныя персанажы.
8. Жанравая своеасаблівасць.
9. Мастацкія асаблівасці твора.
10. Галоўныя падзеі.
11. Галоўная думка.
12. Адносіны аўтара да герояў і падзей.
13. Адносіны вучняў да герояў і падзей.

**Эдзі Агняцвет “Слова пра маці”**
Раней за ўсіх яна ўстае,
пазней за ўсіх кладзецца.
Яна жыве, яна пяе,
– і дзецям лепш пяецца.
Ты рос, як цёплы каласок,
пры месяцы і зорах
Пачуеш мілае "сынок",
хоць будзе і за сорак...
За словам "маці" ў свет пайшлі
маленства, мара, мова.
І мір, і мужнасць па зямлі
– жыцця твайго асновы.
Каб не тужыла па начах,
– ёй падрастай на ўцеху!
Хай будзе ў матчыных вачах
пабольш іскрынак смеху!
Ты не шкадуй ласкавых слоў

для роднай, для адзінай.
Адказвай маці на любоў –
будзь верным, добрым сынам!

**Творчае заданне**
Скласці тэкст “ Мой самы блізкі чалавек”
На дошцы напісаны апорныя словы
Рукі – лепшыя, нястомныя, працавітыя, умелыя.
Голас – мяккі, знаёмы, дарагі, спакойны.
Сэрца – пяшчотнае, залатое, гарачае, чулае.
Вочы - блакітныя, разумныя, задуменныя

**Фізкультхвілінка**
Эй, лежабокі, хутчэй прачніцеся! (вучні ўстаюць)
І да сонца пацягніцеся.(пацягваюцца)
Мы зарадку пачынаем, (хадзьба)
Быць здаровымі жадаем!

Усе распрацоўваем рукі,(рыўкі рукамі)
У іх прага да навукі!
Ногі трэба нам размяць- (падскокі)
Раз, два, тры, чатыры, пяць!

Зараз плечы распрацуем. (падыманне і апусканне плячэй)
Мы без працы не сумуем!
Трэба шыю нам размяць, (павароты галавы)
Каб усім плённа працаваць!

**Васіль Шырко  “ Дзед Манюкін і ўнукі”**

Такога дзеда, як мой, са свечкаю не знойдзеш. Дзесяткі казак ведае. Чуў ён іх ад свайго дзеда, а той - ад свайго. Гісторый у яго - мех пад завязку. Дарослым ён не любіць баяць - не даюць веры, зноў, кажуць, стары дзівак за сваё ўзяўся, ілжэ не падсяваючы. І якіх толькі мянушак не прыдумалі дзеду: і Манюкін, і Мюнхгаўзен, і Ачмуровіч, і Дзед Абуй Лапці... Дзядуля не крыўдуе: што з іх, разумнікаў, возьмеш. Манюкін дык Манюкін, затое дзеці чарадою ходзяць за дзедам - за вушы не адцягнеш іх ад старога. Нават да мяне падлабуньваюцца, каб не прагнаў з надворка; вачэй не спускаюць з дзядулевага крэсіва. А яно, відаць, чарадзейнае, нездарма ён не прызнае запалак і запальнічак. Ды што тыя запалкі!.. Стукне дзед камень аб камень, пасыплюцца іскры, задыміць трут, пыхне люлькай стары, загаворыць: «Э-э, слухайце, саколікі, шчырую праўду раскажу, дзед Манюкін не салжэ. Раней, каб вас качкі ўбрыкнулі, нячыстай сілы, ведзьмаў розных, пярэваратняў, вурдалакаў было, не

раўнуючы, як тых уюноў у старой копанцы». Дзед на ўсякі выпадак пакруціць галавою, ці няма побач каго-небудзь з дарослых, і толькі тады бае далей. А мы стоімся як мышы пад венікам, слухаем. Дзед збіваецца, забягае наперад, паўтараецца... І ўсё ж колькі ні слухай - самае цікавае наперадзе.

Хочаце даведацца, як змагаўся дзед з нячыстай сілай, шчасліва рыбачыў, смела ратаваўся ад мядзведзяў і ваўкоў?.. То не лянуйцеся, перагарніце старонку. Чэснае слова, не пашкадуеце.

## Царскі кужаль

Што ні народ, то свае строі. Які ж гэта мексіканец без самбрэра, паўночнаамерыканскі індзеец без макасін, туркменка без паранджы, а сусед-украінец без кашулі-вышыванкі? Гэта наш брат-беларус усё роўна як саромеецца сваіх строяў. Мне няма чаго саромецца, я - стары чалавек і нейлонаў-шмайлонаў не прызнаю. Апранаю зімой кажух авечы, восенню світку-саматканку. Ёсць на свята боты казловыя, на рыбалку хаджу ў лапцях. Кашуля і штаны ў мяне льняныя. Баба і выткала, і пашыла. На будзень - з грубай пражы, на свята - з тонкай. Нябось, каласочкі-красачкі, вы бачылі на мне вышываную кашулю? Бялей за снег яна, а які арнамент: тут ці не ўсе кветкі зямлі беларускай. Паясы да той кашулі - ого-го! Хоць і язык у бабы Аўдолі без касці, але і майстрыха яна дай божа.

Я і цяпер ніштаваты мужчына, а хлопцам быў зух. Дзяўчаты біліся з-за мяне, адна ледзь не ўтапілася, калі пацалаваў яе сяброўку. І трэба ж, упадабаў бабулю вашу. Глянуў на яе вышыванкі - воч не змог адвесці. Валошкі ў жыце. Луг квітнеючы. Нізка схілілася над вадой вярба...
Быў я вольны казак, а стаў пагляд дзявочы лавіць, яе капрызам патураць. Гляджу на дзяўчыну, а бачу перад сабою яе вышыванкі. Слепіць прыгажосць, вочы адбірае.

Не пражыць беларусу без лёну. Заморскія транты не заменяць ільнянога адзення. І алей з лёну па мне дык куды смачней за аліўкавае масла. Пакрышыш у тыя ж апенькі цыбулі, заправіш іх алеем і на іншую страву не глянеш, пакуль не апарожніш міску.

Эх, казельчыкі-верабейчыкі, на бзік звялі лён. Ні калгасы, ні фермеры амаль не сеюць. Ат, ведама, лянок клопат любіць. Памятаеце песню:

Ох, і сеяла Ўльяніца лянок,
Ох, і сеяла Іванаўна лянок,
Залацісты кужалёк.

Палола Ўльяніца лянок, церабіла, часала, прала, палатно ткала, бяліла, кашулі шыла. Дзе ж ты цяпер знойдзеш такую Ўльяніцу? Па сённяшніх Ульяніцах трын-трава не расці. Не думайце, каласочкі-красачкі, нібыта дзед Манюкін не з той нагі ўстаў, таму і завёў катрынку. Гульма гуляючы, не нажывеш дабра. Не лынды біць і язык мазоліць трэба, а на полі шчыраваць: жыта лашчыць у жмені, каб хутчэй прарасло,

бульбачку даглядаць-песціць, лянок любіць, як Ульяніца. Жыта, бульбу і лянок Бог даў беларусу на радасць. Даражыць імі трэба.

Так думаў-разважаў я, пасучы кароў на Пажарніцы. Вы ведаеце яе - гэта вялікі квяцісты луг за Вэньскай дарогай. Хай не паэт я, а гатоў спяваць гімн Пажарніцы, як спявае вясной жаўрук. На гэтым лузе вочы сумежваю, каб красы самотнай не сурочыць. Бледна-залаты прамень лашчыць твар. Цішыня. І раптам далёка-далёка чую дрыготкі звон. Ён паціху расце, набліжаецца, і ўжо звіняць пераліўныя званочкі. Што гэта? Расплюшчыў вочы - карэта. Па лузе, край поля крылатыя коні імчаць шыкоўную жанчыну ў дымнай сукенцы. У руках жанчыны тонкія ніці. Сыпане іх на лазовы куст - і ўжо не ніці - срэбраную павуціну гайдае лёгкі вецярок. Павуціна на кустах, на кветках. Ці не сама гэта спадарыня-восень выехала на прагулку?

Званочкі звіняць-заліваюцца ўтомна-шчымлівым звонам. Агністыя коні лятуць, не разбіраючы дарогі. Так і да бяды нядоўга. Толькі падумаў, а кола хрусь, і карэта набок пахілілася. Кола, падскокваючы на выбоінах, тарахцела-качілася.

Я падбег да жанчыны, падаў руку. Слава Богу - цэлая, нават не спалохалася, лагодна ўсміхаецца.

Не стэльмах я, але як бачыш тое кола паставіў на месца. Жанчына падзячыла і падала мне лазовы кошык. Не паспеў я падзячыць, як пад дугой зазвінелі званочкі, быстрыя коні панесліся па полі.

Глянуў я ў кошык, а там клубочкі нітак. Ніткі белыя, падсіненыя, чырвоныя, жоўтыя, карычневыя. І спрэс тонкія, як павуцінне. Мусіць, з царскага кужалю пралі іх хвацкія майстрыхі. Кошык важкі, нітак шмат, вось узрадуецца баба, а то скардзілася, што ўсе ніткі выткала, зіма не за гарамі, давядзецца сіднем сядзець, а не за кроснамі шчыраваць.

Прыгнаў я вечарам кароў з пашы і хутчэй да бабы. Кошык з ніткамі падаю. Старая і так і сяк круціла тыя клубкі, а разгледзеўшы, з пацалункамі да мяне палезла.

- Восемдзесят гадоў пражылі мы разам, - кажа, - а лепшага падарунка, спадарочак, ты мне ніколі не дарыў!

Вось дык дагадзіў. Сорак восем гадоў не цалаваліся, а тут на табе, першай старая на шыю кінулася. Цуд, дый годзе!

Ужо ў лістападзе снег зямлю пасерабрыў. І не растаў, бо маразы прыціснулі. Я гаспадарыў па доме: паліў у печы, карміў жывёлу, а старая з ранку да вечара грукала кроснамі. Толькі ў нядзельку брала адпачынак: глядзела тэлевізар, слухала радыё або, насунуўшы на нос акуляры, малявала алоўкам на паперы нейкія ўзоры.

Праз месяц паклікала мяне:

- Ідзі, Манюкін, глянь, які кілім я выткала.

Зірнуў я, каласочкі-красачкі, на той кілім, і аж дух заняло. Дальбог, наша Пажарніца як на далоні.

Вясёлы ветрык саграваe цёплым дыханнем званочкі. Іх быццам нядаўна выкупалі ў сіньцы і паставілі сушыцца на сонцы. Званочкі не паспелі выліняць, яны радуюцца сваёй пекнаце і сарамліва ўсміхаюцца блакітна-белымі ўсмешкамі. А

непадалёку ад іх стаяць купкамі бялюткія, што першы снег, рамонкі. Яны нахілілі свае галовы і аб нечым па-змоўніцку перамаўляюцца. Здаецца, мацней дыхне вецер, зазвоняць званочкі, застракочуць конікі, заспявае жаўрук і сяброўкі-рамонкі пусцяцца ў скокі.

Зайздросціць званочкам і рамонкам дзікая канюшына-дзяцельніца. Хоць і не пакрыўдзіў яе Бог прыгажосцю, а ростам не выйшла. Затое як цвіце, як пахне! І пчолы, і чмялі, і птушкі выцалавалі кожную кветачку, а ў кветачцы тычынку.

Асыпаецца, падае ў траву бязважкі карычневы метлюжок. Ён як суцэльны купал, сцяблінак не відаць. І цвітуць, і радуюць вока пяшчотна-духмяныя краскі маёй зямлі: залатыя і сівыя, журботныя і вясёлыя, але заўсёды неўвядальныя.

А ўгары на паўнеба ззяе вясёлка. Няўжо гэты кілім рукатворны і саткала яго мая баба? Грэх хадзіць па такім нават босаму. Тут ужо я сам кінуўся маю гаспадыню цалаваць.

- Ты прабач мяне, старога балабола, - кажу, - за лясы-балясы, але я і падноскаў тваіх не варты. Такому кіліму не ў хаце нашай месца, а ў сталічным музеі, каб больш людзей убачыла, якая ў нас зямля прыгожая, якія майстры жывуць на ёй.

Заплакала баба ад слоў такіх, абняла мяне. Так і сядзелі мы, як юныя закаханыя, воч не зводзілі з цудоўнага кіліма.

Назаўтра павесілі кілім на сцяне ў чыстай хаце, насупраць акон, каб сонечныя промні траплялі на яго. Рашылі не прадаваць за любыя грошы, хай вісіць на сцяне, вока радуе.

Забегла неяк да нас суседка хлеба пазычыць. Глянула на кілім і застыла, быццам язык праглынула. Забылася нават, чаго прыйшла. Так з адкрытым ротам і выскачыла з хаты. Не ведаю, якую казань казала яна людзям, але ад вяскоўцаў адбою не было. З вечара да раніцы таўкліся ў нас, нават з-пад Чаркеса прыходзілі. Дзверы рып ды рып. Па адным пруць і гуртам. Кожнаму паказвай кілім. Мы ўжо з бабай нервы натузалі: не рады былі, што павесілі той кілім на сцяну, а не схавалі ў куфар.

Неяк раніцай каля нашай хаты аўтобус спыніўся.

- Прымай экскурсію, старая, - пажартаваў я.

Самае смешнае, праўда - экскурсія, як у ваду глядзеў. Настаўніца дзяцей прывезла на наш кілім паглядзець. Бегаюць малыя па хаце, крычаць, калаўрот круцяць, кроснамі ляпаюць, хоць вушы затыкай.

Пэўна, мучыліся б мы з бабай да скону, каб не прыехалі да нас сталічныя госці з музея лёну. Доўга яны тупалі каля кіліма. Зблізку разглядалі яго і здалёк, мацалі. Спрачаліся, пакуль самы важны з іх не сказаў:

- Прадайце, калі ласка, ваш кілім нашаму музею. Мільёны яго ўбачаць, пра вас і вашу вёску даведаюцца...

- Не трэба грошай, - узрадавалася бабуля, - бярыце так.

- Задарма не возьмем, - пакрыўдзіўся начальнік, - гэта ж ручная работа. Калі папраўдзе, то яму цаны няма, усё роўна мы не заплацім, колькі ён каштуе, але грошы ў нас ёсць, дзяржава дала.

Ну і прадалі мы наш кілім. За грошы, што нам заплацілі, можна было б машыну купіць. Баба з тыдзень хадзіла імянінніцай, а там зноў села за кросны. Цэлы куфар тонкага палатна наткала з царскага кужалю. Шмат зім запар шылі мы з яго кашулі, нагавіцы, каптаны, бялізну. Ох, і грэлі ж яны цела, кроў маладзілі.

А кілім наш мы некалькі разоў бачылі: паказвалі па тэлевізіі, казалі, штовыткала яго Аўдоля Манюкіна. Мяне не ўспаміналі ні сном ні духам. Крыўдна.

## Тэлеграма ад Радзівіла

Ой, дзед, ой, хітрун! Апрануўся, як у нядзельку, і ўсё нешта на вуліцу паглядае. Мы хацелі збегаць на рэчку, там акунь добра клюе. Не пускае дзед, пасадзіў нас на лаўку насупраць хаты і зубы замаўляе. Нябось кагосьці чакае... Нас не правядзеш: пэўна, паштальёнку. Вунь яна ходзіць ад хаты да хаты. Зараз каля нас апынецца.

- Дзень добры! - вітаецца цётка Соня. - Вам, дзеду, тэлеграма нейкая дзіўная. З-за мяжы. На пошце начальніца казала - з Англіі, во!

Дзед здзіўлена хмыкнуў, загадаў Алёнцы бабулю гукнуць. Тая адразу ж выйшла на вуліцу, павіталася з паштальёнкай.

- Тут мне тэлеграма, - сказаў дзед, - нібыта ад ангельцаў. Там у мяне блізкіх сяброў і сваякоў нямашака, хіба што стрыечны брат успомніў...

- Чулі, чулі, - засмяялася бабуля, - князь Радзівіл. Ты, Сонечка, не зважай на старога дурня. Ён, калі ўчаўпе сабе што-небудзь у галаву, то сам сабе паверыць. Знайшоўся мне нашчадак Радзівілаў!

- Але тэлеграма сапраўды з Лондана, - сказала паштальёнка, - і падпісаў яе Радзівіл.

Каб гром грымнуў з яснага неба, мы так бы не здзівіліся. І баба Аўдоля, і мы з Алёнай, і хлапчукі-суседзі быццам анямелі.
- Чытай ужо хіба, - папрасіў паштальёнку дзед, - я акуляры ў хаце пакінуў.

*«Паважаны спадар Манюкін, - прачытала цётка Соня, - у бліжэйшы час я прышлю афіцыйнае пацвярджэнне, што вы належыце да самага старажытнага і шляхетнага роду Радзівілаў. З гэтай паперай вас, несумненна, прымуць у клуб беларускай шляхты пад старшынствам дробнага шляхцюка Г.*

*Такі смелы, знаходлівы і рашучы чалавек, як вы, не можа не належаць да нашага слыннага роду.*

*Чытаю кнігу аб Вашых прыгодах. Разам з Вамі ваюю з нячысцікамі, ратую звяроў і птушак, баю дзецям казкі.*

*Сто лят Вам жыцця, добрага здароўя, шчасця.*

*Ваш Радзівіл*

*Лёндан. Вялікабрытанія.*

*31 жніўня, год 1999-ы ад Нараджэння Хрыстова».*

Дзед пераможна глянуў на бабулю. Як самы сапраўдны шляхціч, пацалаваў руку паштальёнцы, забраў тэлеграму і, падміргнуўшы нам, падшывальцам, пайшоў у хату, кінуўшы няўзнак: «Нягожа, калі беларускай шляхтай запраўляе драбнарыбіца. Тут на самацёк пускаць нельга... ой, нельга».

Мы моўчкі глядзелі ўслед. Ну і дзед, усіх здзівіў. Гэта ж трэба, сам Радзівіл даў яму тэлеграму. Вунь як горда барадой затрос. Мусіць, і нам з Алёнай не выпадае з кім папала хаўрусаваць. Мы - беларусы!

## ІУ. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

Віктар Швед

Я НАРАДЗІЎСЯ БЕЛАРУСАМ

Я нарадзіўся беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную клянуся
Шанаваць, цаніць, любіць.
Сваю родную старонку
Я люблю як і бацькоў,
Што вучылі песні звонкай,
Прывівалі мне любоў:
І да мовы, да дубровы,
Да палёў і да лугоў.
І заўсёды да народа,
Што жыве тут ад вякоў.
Я клянуся: не зракуся
ваё роднае любіць.
Быў і буду беларусам,
Пакуль толькі буду жыць!

- Як вы разумееце такія словазлучэнні: “радавіты чалавек”, “пакаленні радаводу”, “жаночы род”, “мужчынскі род”?
- Патлумачце выказванні: “Без роду, без племені”, “З роду ў род”, “Весці свой род”, “На раду напісана”, “Няма роду без выроду”.
- Разгадаўшы рэбус, даведаецеся, як называецца навука, якая вывучае паходжанне і роднасныя сувязі людзей некалькіх пакаленняў, іх радавод:




- А зараз паслухайце прытчу “Паважай бацьку свайго” і адкажыце, якім чынам яна звязана з тэмай нашага ўрока?

Жыў аднойчы вельмі стары чалавек. Вочы яго амаль аслеплі, пагоршыўся слых, і рукі дрыжалі. Ён амаль не мог трымаць лыжку і ў час яды часта разліваў суп. Яго родны сын і яго маладая жонка пачалі ў час яды садзіць старога за печку, ежу яму падавалі ў старой талерцы. Адтуль стары сумна глядзеў на стол, і вочы яго станавіліся вільготнымі. Аднойчы рукі яго так дрыжалі, што ён не змог утрымаць талерку і тая разбілася. Маладая гаспадыня пачала сварыцца на старога. А той толькі цяжка ўздыхнуў. Тады сын з нявесткай купілі старому драўляную – самую танную з тых, што знайшлі – міску. Цяпер ён павінен быў есці з яе.

Аднойчы, калі маладыя бацькі сядзелі за сталом, у пакой увайшоў іх пяцігадовы сын з кавалкам дрэва ў руках.

- Што ты будзеш рабіць з гэтым паленам? – спытаў бацька.

- Драўляную міску, - адказаў малы. – З яе тата з мамай будуць есці, калі я вырасту.

Чаму вучыць гэта прытча?
Якая прыказка з тых, што гучалі сёння на ўроку, раскрывае яе сэнс?

**У. ПРАГЛЯД МУЛЬТФІЛЬМА “ДЗЕД”**
**Гутарка па змесце**

Радзіме - за мір,
за жыцце - сваёй маці,
птушцы - за спеў,
за дах – роднай хаце,
полю - за хлеб, што ляжыць на стале,
Сонцу за свет, за цяпло на Зямле,
ночцы за сон, што дае адпачыць,
школе, сябрам, што цікава так жыць!

Вас толькі прашу я, сябры, не забудзьце -
Заўсёды і ўсюды ўдзячнымі будзьце!

**УІ. РЭФЛЕКСІЯ**

Пры дапамозе дзеясловаў, запісаных на дошцы, складзіце пункты Закона РОДУ.
Паважайце...
Цаніце...
Беражыце...
Дапамагайце...
Прыслухоўвайцеся...
Віншуйце...
Наведвайце...
*Павагай да людзей і ў дзень будзённы,*
*І ў святы няхай напоўніцца твой дом.*
*Тады парог не пераступяць беды,*
*Сяброўскіх рук адчуеш ты цяпло,*
*Жыві, твары і мудрасць продкаў ведай:*
*Пасей дабро - тады пажнеш дабро.*

**УІІ. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ**

Рэкамендацыі да наступнага ўрока пазакласнага чытання
Эдзі Агняцвет. «Кліча вецер свежы».
Анатоль Астрэйка. «Родная краіна».
Артур Вольскі. «Славы даўняй адгалосак», «Мой скарб».
Алесь Гурло. «Мой край».
Васіль Жуковіч. «Цудоўная краіна», «Беларус», «Няма даражэйшай зямлі», «Беларуская старонка» «Францішак Скарына».
Анатоль Зэкаў. «Па-беларуску і па-руску», «Чатыры зярняткі».
Уладзімір Карызна. «Песня аб родным».
Яўген Крупенька. «Два словы»
Уладзімір Ліпскі. «Замак без замка», «Салігорскія агні».
Уладзімір Мазго. «Мірскі замак».
Мікола Маляўка. «Полацк».
Георгій Марчук. «Як Несцерка французаў перахітрыў».
Міхась Пазнякоў. «Адказ сыну», «Радзіма», «У бары», «Заўжды вярнуся».
Алесь Пісьмянкоў. «Мы — беларусы».
Кастусь Цвірка. «Там яна».
Вольга Шпакевіч. «Мая зямля».
Уладзімір Ягоўдзік. «Нясвіжскі палац», «Статут Вялікага Княства», «Сынковіцкая царква».